Кобрынская раённая цэнтралізаваная
бібліятэчная сістэма
Аддзел абслугоўвання і інфармацыі

**Серыя «Адукацыя на Кобрыншчыне»**

# Творчая гавань для юных талентаў

***Да 75-годдзя з часу заснавання дзяржаўнай установы адукацыі «Кобрынскі раённы цэнтр дзіцячай творчасці»***

**Інфармацыйна-бібліяграфічнае выданне**

Кобрын
2025

УДК 016:37.018(476.7)
ББК 91.9:74.200.587(4Беи)
Т28

Серыя заснавана ў 2020 годзе

***Складальнік***
С. Д. Курачук - бібліёграф I катэгорыі
аддзела абслугоўвання і інфармацыі
Кобрынскай раённай цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы

Т28 **Творчая гавань для юных талентаў** : інфармацыйна-бібліяграфічнае выданне да 75-годдзя з часу заснавання дзяржаўнай установы адукацыі «Кобрынскі раённы цэнтр дзіцячай творчасці» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. С. Д. Курачук. – Кобрын, 2025. – 48 с. : фат. – (Серыя «Адукацыя на Кобрыншчыне»).

Інфармацыйна-бібліяграфічнае выданне «Творчая гавань для юных талентаў» з серыі «Адукацыя на Кобрыншчыне» дае магчымасць азнаёміцца з вехамі гісторыі і вопытам работы дзяржаўнай установы адукацыі «Кобрынскі раённы цэнтр дзіцячай творчасці», традыцыямі і дасягненнямі, узорнымі калектывамі. Паказальнік адрасаваны ўсім, хто займаецца вывучэннем роднага краю, цікавіцца яго гісторыяй, адукацыяй, культурай.

**УДК 016:37.018(476.7)**
**ББК 91.9:74.200.587(4Беи)**

© Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, 2025

# АД СКЛАДАЛЬНІКА

Інфармацыйна-бібліяграфічнае выданне «Творчая гавань для юных талентаў» з серыі «Адукацыя на Кобрыншчыне» прысвечана 75-гадоваму юбілею дзяржаўнай установы адукацыі «Кобрынскі раённы цэнтр дзіцячай творчасці». Дата заслугоўвае ўвагі, бо гісторыя цэнтра дзіцячай творчасці ўражвае. На працягу многіх гадоў яго імя гучыць усё мацней і мацней, скарбонка ўзнагарод і дасягненняў расце.

Неад'емнай часткай агульнаадукацыйнай сістэмы раёна з'яўляецца дадатковая адукацыя, да сферы якой адносіцца цэнтр дзіцячай творчасці. Востравам творчасці і шчасця часта называюць установу, дзверы якой адчынены для ўсіх таленавітых і ініцыятыўных дзяцей Кобрыншчыны. Тут знайшлі сябе, рэалізавалі свае магчымасці і прафесійна вызначыліся сотні хлопчыкаў і дзяўчынак, а да творчасці далучыліся тысячы.

На працягу многіх гадоў Цэнтр застаецца яркім асяродкам культурнага і адукацыйнага жыцця горада, дзе пад адным дахам аб'яднаны дзясяткі гурткоў і секцый. Гэта ўнікальны Цэнтр, які адкрывае новыя гарызонты для творчай самарэалізацыі юных жыхароў Кобрыншчыны. Мяняліся адрасы, назвы, калектывы гэтай установы, але нязменнымі заставаліся лепшыя традыцыі - увага і любоў да дзяцей, клопат аб іх усебаковым і творчым развіцці.

Юбілейнае выданне «Творчая гавань для юных талентаў» дае магчымасць пазнаёміцца з гісторыяй заснавання і сённяшнім днём дзяржаўнай установы адукацыі «Кобрынскі раённы цэнтр дзіцячай творчасці»,

дасягненнямі, традыцыямі ўстановы, творчымі калектывамі.

Выданне мае наступную структуру:

**Ад складальніка**

**I. Ад Дома піянераў да нашых дзён**

*Гісторыя станаўлення*

**II. Горад дзяцінства ў горадзе**

*Дзень сённяшні*

**III. Ад таленавітага педагога да таленавітага дзіцяці**

*Узорныя калектывы РЦДТ*

▲*танцавальны калектыў «Пралесачкі»*

▲*вакальная студыя «Крыніца»*

▲*ансамбль сучаснага танца «Модерн»*

▲*інструментальная група «Хороший день»*

▲*студыя выяўленчага мастацтва*

**Спіс крыніц**

Інфармацыйна-бібліяграфічнае выданне «Творчая гавань для юных талентаў» прадстаўляе больш за 150 бібліяграфічных крыніц. Уключае артыкулы з перыядычных выданняў, пачынаючы з 1971 года. Кнігі размешчаны ў алфавіце аўтараў, назваў кніг, артыкулы – па гадах у зваротнай храналогіі, унутры года – у алфавіце аўтараў, загалоўкаў. Для раскрыцця зместу пры неабходнасці да запісаў даюцца кароткія даведачныя анатацыі.

Выданне змяшчае фотаздымкі розных гадоў з фотаархіва і сайта дзяржаўнай установы адукацыі «Кобрынскі раённы цэнтр дзіцячай творчасці», а таксама з фотагалерэі Кобрынскай раённай цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы.

# I. АД ДОМА ПІЯНЕРАЎ ДА НАШЫХ ДЗЁН

## *Гісторыя станаўлення*

У СССР была створана шырокая сетка пазашкольных устаноў, якія вялі работу з вучнямі ў пазаўрочны час.

Хуткая плынь часу… Гэта быў 1950 год. 5 лістапада ў невялікім аднапавярховым будынку пачаў сваю дзейнасць раённы Дом піянераў і школьнікаў, з адкрыцця якога і пачынаецца гісторыя дадатковай адукацыі ў Кобрыне. Першым дырэктарам установы стаў Міхаіл Барысавіч Берлін. У трох пакоях, якія ледзь змясцілі ўсіх жадаючых тварыць, працавалі чатыры гурткі дэкаратыўна-прыкладнай творчасці.



Ішлі гады, і Дом піянераў пастпова пашыраў сферу сваёй дзейнасці: павялічвалася колькасць гурткоў, далучаліся новыя творчыя накірункі. З 1952 года па 1958 год Дом піянераў узначальвала Надзея Максімаўна Дзёміна. Установа становіцца цэнтрам, дзе папаўняюць свае веды старшыя піянерважатыя школ.



У 1958 годзе дырэктарам Дома піянераў стала Вольга Анатольеўна Здановіч, якая пазней узначаліла Рэспубліканскі Палац піянераў. Пашырылася сетка гурткоў. Загучалі дзіцячыя галасы ў харавым, вакальным, драматычным гуртках, на сцэну выходзілі аматары паэзіі з аб'яднання «Мастацкае слова».



Вялікай папулярнасцю ў піянераў таго часу карысталіся гурткі інавацыйнай накіраванасці: лялечны (кіраўнік М. К. Пячонкіна), мадэліравання, шахматны (кіраўнік С. Д. Смакоцін), радыётэхнічны (кіраўнік В. П. Місюк), фотагурток (кіраўнік У. І. Куштэль).





У 1962 годзе Дом піянераў і школьнікаў пераведзены ў былы клуб афіцэраў па вуліцы Леніна, 43. Будынак каля моста стаў месцам творчай самарэалізацыі некалькіх пакаленняў дзяцей.



Ідэйнымі арганізатарамі цікавых спраў былі неабыякавыя да дзяцей супрацоўнікі ўстановы, таленавітыя педагогі, якія прасоўвалі новыя напрамкі работы. Пачынае сваю дзейнасць танцавальны гурток (кіраўнік Д. П. Луферава), студыя выяўленчага мастацтва (кіраўнік Л. Д. Мілаяніна), клуб старшакласнікаў «Равеснік» (кіраўнік М. У. Цюшкевіч), гурток юнкораў (кіраўнік Л. К. Багдановіч).

За вялікую работу па выхаванні і навучанні школьнікаў, актыўны ўдзел ва Усесаюзным аглядзе пазашкольных установ Кобрынскі Дом піянераў быў узнагароджаны дыпломам І ступені Міністэрства асветы БССР, Ганаровымі граматамі Цэнтральнага Савета Усесаюзнай піянерскай арганізацыі імя У. І. Леніна, Цэнтральнага камітэта Ленінскага камсамола і інш.

Дванаццаць гадоў (1978–1990) калектыў Дома піянераў і школьнікаў узначальвала Валянціна Арсенцьеўна Астраух, выдатнік асветы БССР. У гэты перыяд студыя выяўленчага мастацтва (кіраўнік А. Р. Зуброў) атрымала ганаровае званне «народная», эстрадны ансамбль «Крыніца» (кіраўнік М. І. Мацвяйчук) – званне «ўзорны», Дом піянераў неаднаразова ўзнагароджваўся ганаровымі граматамі рознага ўзроўню. Дзякуючы намаганням Валянціны Арсенцьеўны быў сабраны найбагацейшы матэрыял па гісторыі Кобрыншчыны і створаны гісторыка-краязнаўчы музей.

У 1980-я гады Дом піянераў актыўна ўдзельнічаў у працоўных піянерскіх акцыях. І добрыя справы піянераў і камсамольцаў не засталіся без увагі. Да 80-годдзя пісьменніка Аркадзя Гайдара на сродкі ад сабранага піянерамі металалому на адным з машынабудаўнічых прадпрыемстваў СССР быў зроблены аўтобус з надпісам «Аркадзь Гайдар». У гонар 700-годдзя Кобрына, дзякуючы вялікай колькасці сабранага піянерамі металалому, раён атрымаў аўтобус «Аляксандр Сувораў».



А шэсць трактароў «МТЗ-80» былі перададзены лепшым камсамольцам Кобрыншчыны. Таленавітыя выхаванцы заахвочваліся імяннымі пуцёўкамі ва ўсесаюзны лагер «Артэк». У 1986 годзе гонару стаць удзельнікамі дзіцячай праграмы ў Артэку ў рамках XII Сусветнага фестывалю моладзі і студэнтаў былі ўдастоены вакалісты эстраднай студыі «Крыніца».

Гарадскія школьнікі мелі шырокія магчымасці для заняткаў па інтарэсах у Доме піянераў, а для дзяцей з сельскіх населеных пунктаў у 1980 годзе быў адкрыты Кобрынскі раённы Дом піянераў і школьнікаў (пазней - раённы Дом дзіцяча-юнацкай творчасці). Узначаліла яго Ларыса Іванаўна Царова, якая займала гэтую адказную пасаду 17 гадоў.

У 1990 годзе Дом піянераў і школьнікаў быў перайменаваны ў Дом творчасці юных, і яго ўзначаліла Галіна Дзмітрыеўна Кабакова, чалавек невычэрпнай творчай энергіі. Адным з вядучых напрамкаў дзейнасці ўстановы становіцца мастацкая самадзейнасць. Юныя спевакі і танцоры пабывалі з творчымі візітамі ў Югаславіі, Харватыі, Македоніі, Польшчы, Расіі і інш. Сапраўдным трыўмфам стала пераможнае выступленне выхаванкі вакальнай студыі «Музычная палітра» Вольгі Сацюк (кіраўнік І. К. Чырун) на першым дзіцячым конкурсе «Еўрабачанне», якое праходзіла ў Даніі ў 2003 годзе.



У гэты час два танцавальныя калектывы «Пралесачкі» (*кіраўнік С. І. Чырун*) і «Калі ласка» (*кіраўнік М. І. Возняк*) удастоены звання «ўзорны».



Чарговы пераезд адбыўся ў 1994 годзе,



калі на той час ужо Дом творчасці юных стаў прымаць дзяцей па новым адрасе: вуліца Панфілаўцаў, 6.

З прыходам таленавітых педагогаў з’яўляюцца новыя напрамкі працы. Педагогі дадатковай адукацыі ўстановы працягваюць весці карпатлівую работу па выхаванні ў дзяцей працавітасці, імкнення да ведаў, творчасці.

Кобрынскі Дом творчасці юных - гэта вялікая адзіная сям'я, гісторыя якой неаддзельная ад нашага горада і раёна. Гэта лёсы сотняў хлапчукоў і дзяўчынак, многім з якіх менавіта тут дапамаглі знайсці прызванне; гэта дзясяткі педагогаў, перакананых у тым, што кожнае дзіця таленавітае.

# II. ГОРАД ДЗЯЦІНСТВА Ў ГОРАДЗЕ

## *Дзень сённяшні*



За сваю гісторыю раённы цэнтр дзіцячай творчасці неаднаразова мяняў не толькі прапіску, але і назву. У 2002 годзе ў сувязі з аб'яднаннем Кобрынскага гарадскога і раённага выканаўчых камітэтаў гарадскі Дом творчасці юных і раённы Дом дзіцяча-юнацкай творчасці аб'ядналіся ў адну ўстанову - раённы цэнтр дзіцячай творчасці (РЦДТ). Установа атрымала сучасную назву.

З 2005 года РЦДТ узначаліла Вольга Мікалаеўна Шугай. Шмат сіл і энергіі аддае дырэктар стварэнню камфортных умоў для работы педагагічнага калектыву. Дзіцячая творчасць у Цэнтры пашырае не толькі межы сфер дзейнасці, але і геаграфію выступленняў. Кобрынскіх дзяцей ведаюць у іншых рэгіёнах Беларусі, у блізкім і далёкім замежжы.

У 2013 годзе звання «ўзорны» ўдастоены ансамбль сучаснага танца «Мадэрн» (*кіраўнік Т. А. Масайла*). У гэтым жа годзе адкрываецца аддзел турысцка-краязнаўчай работы, дзе праводзіцца вялізная работа па вывучэнні свайго краю, актывізуецца турыстычная дзейнасць.



З верасня 2014 года дзяржаўную ўстанову адукацыі «Кобрынскі раённы цэнтр дзіцячай творчасці» ўзначальвае Наталля Васільеўна Белая, якая, як і папярэднія кіраўнікі ўстановы, сваім запалам і аптымізмам падштурхнула калектыў да новых творчых пошукаў.

У 2015 годзе ў Цэнтры працуе 159 аб'яднанняў па інтарэсах, 65 педагогаў ажыццяўляюць адукацыйны працэс і больш за 3.000 навучэнцаў наведваюць аб'яднанні па інтарэсах. З верасня 2015 года пачынае функцыянаваць аддзел тэхнічнай творчасці. З верасня 2019 года аддзел турызму і краязнаўства пераведзены ў эколага-біялагічны цэнтр.

Цэнтр дзіцячай творчасці мае шырокі спектр магчымасцей для выбару дзецьмі і падлеткамі сферы развіцця і рэалізацыі свайго творчага патэнцыялу. Дзецям ёсць што прапанаваць у альтэрнаціву часу за камп’ютарам і вуліцы.

Сённяшні дзень установы – гэта чатыры аддзелы:

▲ аддзел мастацкай творчасці;

▲ аддзел выяўленчага мастацтва і дэкаратыўна-прыкладной творчасці;

▲ аддзел тэхнічнай творчасці;

▲ аддзел сацыяльна-педагагічнай работы, у якім ажыццяўляецца інтэлектуальная, валанцёрская, міра-творчая, швейная, кулінарная дзейнасць.

Для задавальнення інтарэсаў і запытаў дзяцей у Цэнтры працуюць 152 аб'яднання па інтарэсах, у якіх займаюцца 1.850 навучэнцаў ва ўзросце ад 4 да 18 гадоў, і кожны з іх можа выбраць справу па душы і дабіцца поспехаў. Ажыццявіць свае мары змогуць усе: і тыя, каго вабіць сцэна, і тыя, хто імкнецца выхаваць і развіць лідарскія якасці, і той, хто ахвочы да стварэння прыгожага ўмелымі рукамі, і тыя, хто хочуць адчуць багацце гістарычнай спадчыны роднага рэгіёна. Нікому не будзе сумна ў разнастайных шматлікіх аб’яднаннях.

Значнасць атрыманай у РЦДТ адукацыі пацвярджае паступленне навучэнцаў у вышэйшыя, сярэднія спецыяль-ныя навучальныя ўстановы і працаўладкаванне па профілі. Дарэчы, у сценах Цэнтра свае першыя крокі ў творчасці рабілі цяпер вядомыя артысты Тэа, Герман Цітоў, Аляк-сандр Гелах і Вольга Сацюк.









Патэнцыял усіх педагогаў Кобрынскага РЦДТ вялікі, і, працуючы шмат гадоў, яны не спыняюцца на дасягнутым, увесь час развіваюцца, імкнуцца ўносіць у працу нешта новае, цікавае.






Знакавыя мерапрыемствы Цэнтра – фестываль творчасці дашкольнікаў «Сузор'е маленькіх талентаў», выстава дзіцячай творчасці «У саюзе таленту і прыгажосці», фестываль клубаў інтэлектуальных гульняў «Кобрынскія сезоны», фестываль дзіцячай творчасці «Ветразь дзяцінства», выстава тэхнічнай творчасці «Музей на стале» і інш.

Педагогі Кобрынскага РЦДТ штогод арганізоўваюць выставу «Мы - разам» і інклюзіўны фестываль «Творчы калейдаскоп», накіраваныя на падтрымку дзяцей з

асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця. У ліку задач, якія стаяць перад сістэмай дадатковай адукацыі, - выхаванне дастойных грамадзян краіны, людзей, якім будуць не чужыя пачуцці суперажывання чужому болю, спагады, дабрыні. Аднымі з самых маштабных па колькасці ўдзельнікаў мерапрыемстваў сталі раённы конкурс дзіцячай творчасці «Упрыгожым храм разам» і дабрачынны праект «Давайце тварыць дабро».

Акрамя таго, у РЦДТ займаюцца навучэнцы з асаблівасцямі развіцця. Для іх працуюць аб'яднанні па інтарэсах «Маляванне», «Пясочныя забавы», «Залатая саломка», «Саломка», «Кераміка» і «Тэрыторыя красамоўства».



1 кастрычніка 2019 года расчыніў свае дзверы адукацыйны іміджавы пакой па бяспецы «Чырвоная кнопка», асноўнай мэтай работы якога з'яўляецца навучанне дзяцей дашкольнага, малодшага школьнага ўзросту правільным дзеянням пры ўзнікненні розных надзвычайных сітуацый.

22 чэрвеня 2023 года адкрыта музейная экспазіцыя «Кобрыншчына ваенна-гістарычная», якую наведалі многія вучні школ горада і раёна.





Знакавым для РЦДТ стаў 2024 год у сувязі з прысваеннем ганаровага звання «Школа міру». Юныя міратворцы ўдзельнічаюць у сустрэчах са сведкамі падзей Вялікай Айчыннай вайны, воінамі-інтэрнацыяналістамі, арганізуюць і праводзяць мерапрыемствы, накіраваныя на прапаганду міру і ўзаемаразумення.



Кожнае лета ў Цэнтры працуе лагер дзённага знаходжання «Кружковец», дзе прапануюцца новыя мадэлі арганізацыі дзіцячага адпачынку.

Дзейнасць цэнтра дзіцячай творчасці адзначалася на самым высокім узроўні. За ўсю гісторыю ўстановы сабралася вялікая скарбонка ўзнагарод. Так, толькі за 2024 год творчыя калектывы і навучэнцы РЦДТ прынялі ўдзел у 26 мерапрыемствах міжнароднага ўзроўню і заваявалі на іх 59 узнагарод, у 13 мерапрыемствах рэспубліканскага значэння, з якіх прывезлі 39 узнагарод, і ў 25 мерапрыемствах абласнога ўзроўню, на якіх атрымалі 86 узнагарод.

Цэнтр дзіцячай творчасці сёння - гэта шматпрофільная ўстанова дадатковай адукацыі, у якой ажыццяўляецца адукацыйная, выхаваўчая, метадычная, сацыяльная і забаўляльная дзейнасць. Гэта дружны і творчы калектыў педагогаў і дзяцей, якіх аб'ядноўвае імкненне

зрабіць сваё жыццё цікавым, насычаным, карысным грамадству, які даў тысячы пуцёвак у жыццё творчым асобам.

РЦДТ - гэта навучэнцы, чые дасягненні і перамогі - годны прыклад для пераймання, гэта таленавітыя, мудрыя, неабыякавыя педагогі, гэта бацькі, якія падтрымліваюць дзяцей ва ўсіх пачынаннях. Поспех дзейнасці калектыву шмат у чым вызначае атмасфера даверу, супрацоўніцтва педагогаў, навучэнцаў і іх бацькоў.

Ёсць у нашым жыцці цудоўная традыцыя - адзначаць юбілеі. Якім бы ні быў юбілей, вялікім ці маленькім, вясёлым ці сумным, але гэта заўсёды вынік, вынік пражытага адрэзка жыцця. Нягледзячы на салідны ўзрост, Кобрынскі цэнтр дзіцячай творчасці малады душой. Ён дынамічна развіваецца, смела асвойвае сучасныя напрамкі і захоўвае жывую сувязь пакаленняў. А закладзеныя шмат гадоў таму традыцыі набываюць новае гучанне.





Прайшоўшы шлях станаўлення ад раённага Дома піянераў да Цэнтра дзіцячай творчасці, за ўстановай трывала замацаваўся імідж прэстыжнага дзіцячага шматпрофільнага цэнтра.



## 75 гадоў у рытме творчасці!



За мінулыя 75 гадоў адбылося шмат перамен, вельмі моцна змяніліся і самі дзеці, якія наведваюць Цэнтр. Але нязменным застаецца адно: цэнтр дзіцячай творчасці па-ранейшаму застаецца домам, у якім жывуць ДЗЯЦІНСТВА, ТВОРЧАСЦЬ, НАТХНЕННЕ.

Безумоўна, у Кобрынскага раённага цэнтра дзіцячай творчасці з БАГАТАЙ гісторыяй ЯРКАЯ, НАТХНЯЛЬНАЯ будучыня!











# III. АД ТАЛЕНАВІТАГА ПЕДАГОГА ДА ТАЛЕНАВІТАГА ДЗІЦЯЦІ

## *Узорныя калектывы РЦДТ*



Асаблівым гонарам Кобрынскага раённага цэнтра дзіцячай творчасці з’яўляюцца яго самыя тытулаваныя калектывы са званнем «узорны»:

танцавальны калектыў «ПРАЛЕСАЧКІ» (*кіраўнік С. І. Чырун, з 2024 г. - Г. А. Паўлючык*);

вакальная студыя «КРЫНІЦА» (*кіраўнік М. І. Мацвяйчук, з 2021 г. - В. Д. Алесік);*

ансамбль сучаснага танца «МОДЕРН» (*кіраўнік Т. А. Арцюшэўская)*;

інструментальная група «ХОРОШИЙ ДЕНЬ» (*кіраўнік А. А. Возняк*);

студыя выяўленчага мастацтва (*кіраўнік А. Р. Зуброў, з 2024 г. - Н. Я. Скарга*).

У кожнага з гэтых калектываў свая ўнікальная творчая біяграфія і свая адметная калекцыя ўзнагарод беларускіх і міжнародных конкурсаў, а іх кіраўнікі — людзі не толькі з багатым педагагічным вопытам, але і з вялікім жаданнем пастаянна рабіць штосьці новае, з незгасальным творчым агнём у сэрцы. Гэта яскравае сведчанне высокага прафесіяналізму, шматграннага таленту і карпатлівай працы, якія знайшлі заслужанае прызнанне.

# Танцавальны калектыў «Пралесачкі»




«Пралесачкі» залатымі літарамі ўпісалі ў культурную гісторыю Кобрыншчыны свае гучныя дасягненні. Гэта самы вядомы, тытулаваны і любімы публікай калектыў Кобрынскага раённага цэнтра дзіцячай творчасці. Званне ўзорнага прысвоена ў 1995 годзе, і з таго часу кожныя тры гады калектыў паспяхова яго пацвярджае.



Стваральнікам і кіраўніком «Пралесачак» з’яўляецца Святлана Іосіфаўна Чырун - выдатнік адукацыі Рэспублікі Беларусь, стыпендыят прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі, ганаровы грамадзянін Кобрынскага раёна.

Калектыў паспахова прэзентуе гледачам арыгінальны творчы прадукт – сімбіёз традыцыйных і сучасных танцаў, якія, несумненна,

прываблівае і захапляе. Усяго ў рэпертуары ансамбля больш за 30 канцэртных нумароў, сярод якіх пераважаюць беларускія народныя і сучасныя дзіцячыя сюжэтныя танцы. Пастаноўкі робяцца на аснове фальклорных танцаў, выкарыстоўваецца мясцовы матэрыял.

Выхаванцы калектыву разам з кіраўніком С. І. Чырун ездзілі па беларускіх вёсках, вывучалі касцюмы, традыцыі, збіралі і запісвалі фальклорныя элементы, якія цяпер і выкарыстоўваюцца ў танцах. Калектыў літаральна па крупінках збіраў мясцовы танцавальны фальклор, які дазваляе прадставіць танцавальнае мастацтва першай паловы мінулага стагоддзя. Разам з тым актыўна развіваюцца сучасныя танцавальныя стылі і тэхнікі. Гэтае гарманічнае спалучэнне культуры мінулага і сучаснасці спрыяе ўсебаковаму развіццю юных танцораў, далучае іх да высокага мастацтва.

Танцавальны калектыў «Пралесачкі» - удзельнік шматлікіх рэспубліканскіх і міжнародных конкурсаў, лаўрэат абласных і раённых аглядаў-конкурсаў і фестываляў, жаданы госць усіх гарадскіх мерапрыемстваў. Юным танцорам удалося пакарыць такія фестывалі, як



«Сонца, радасць, прыгажосць», «Музыкі святло», «Саюз непарушны», «Крылы», «Таленты Беларусі»... Гэты спіс можна працягваць доўга. Ім апладыравалі ў Расіі, Украіне,

Балгарыі, Грэцыі. Іх талентам і майстэрствам захапляліся нават сапернікі.

Удзельнічаючы ў музычных форумах рознага ўзроўню, калектыў пастаянна ўдасканальвае сваё майстэрства. Займаюцца ў калектыве дзеці чатырох узроставых груп: старэйшай, сярэдняй, малодшай і падрыхтоўчай. На сцэну юныя танцоры выходзяць, як правіла, на другім годзе навучання.



Дарэчы, многія выпускнікі ансамбля пабудавалі творчую кар'еру і паспяхова працуюць нават у такіх вядомых на ўсю краіну прафесійных калектывах, як дзяржаўны ансамбль танца «Харошкі», нацыянальны акадэмічны народны хор Рэспублікі Беларусь імя Г. І. Цітовіча, заслужаны калектыў Рэспублікі Беларусь ансамбль танца, музыкі і песні «Белыя росы» Дзяржаўнай філармоніі ў г. Гродна, узорна-паказальны аркестр унутраных войскаў МУС. Сёння многія выпускнікі калектыву самі з'яўляюцца харэографамі.

З 2024 года танцавальны калектыў узначаліла Ганна Аляксандраўна Паўлючык, вучаніца Святланы Іосіфаўны Чырун. Дарэчы, трэба адзначыць, што многія выпускнікі РЦДТ пасля атрымання адукацыі вяртаюцца ў родную альма-матэр.

# Вакальная студыя «Крыніца»



У верасні 1979 года пры гарадскім Доме піянераў і школьнікаў быў створаны эстрадны ансамбль «Крыніца». Кіраўнік — Мікалай Ігнатавіч Мацвяйчук, ветэран педагагічнай працы, які больш за 30 гадоў развіваў музычныя здольнасці сваіх вучняў. Дзеці з вялікім задавальненнем вучыліся іграць на розных музычных інструментах, спявалі песні розных жанраў. Калектыў стаў пастаянным удзельнікам канцэртных праграм горада, раёна, вобласці. Удзельнікі ансамбля пабывалі на тэлевізійным рэспубліканскім фестывалі «Чырвоныя гваздзікі», у лагеры «Артэк». З часам ансамбль перарос у эстрадную студыю, дзе займалася каля 40 хлопчыкаў і дзяўчынак. Упершыню званне ўзорнага калектыў атрымаў у 1987 годзе і з таго часу кожныя тры гады паспяхова яго пацвярджае.



Застаючыся на традыцыях, закладзеных першым кіраўніком М. І. Мацвейчуком, калектыў не стаіць на месцы

- з кожным годам расквітае, шукае новыя ідэі і таму заўсёды малады і цікавы гледачу.

З году ў год скарбонка ўзнагарод студыі «Крыніца» папаўняецца дыпломамі розных ступеней міжнародных, рэспубліканскіх, абласных конкурсаў.




У рэпертуары калектыву вялікая колькасць вакальных нумароў - эстрадныя песні, песні з народнай стылістыкай, ёсць і рок.

У 2024 годзе салісты ўзорнай вакальнай студыі «Крыніца» пабывалі на XXXIII Міжнародным фестывалі мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску».

Студыя «Крыніца» вядзе актыўную грамадска-культурную і канцэртную дзейнасць, што з'яўляецца стымулам творчага росту юных выканаўцаў.

З верасня 2021 года Вольга Дзмітрыеўна Алесік змяніла сваю калегу Аксану Амельянюк і ўзначаліла калектыў.



# Ансамбль сучаснага танца «Модерн»






Прастора, час, энергія — вось тры канстанты, на якіх будуе сваю працу кіраўнік узорнага ансамбля сучаснага танца «Модерн» Таццяна Аляксандраўна Арцюшэўская.

Сваю творчую дзейнасць ансамбль пачаў у 2001 годзе. Паспяховаму развіццю ансамбля садзейнічае стабільны састаў навучэнцаў, разнастайны рэпертуар, прафесійны рост. Навучэнцы калектыву вывучаюць асновы харэаграфіі, музычную грамату, рухі сучасных накірункаў танца.

У 2013 годзе ансамблю сучаснага танца «Модерн» было прысвоена ганаровае званне «ўзорны». Юныя выканаўцы ансамбля дэманструюць прыгажосць і арыгі-

нальнасць сучаснай харэаграфіі на ўсіх маладзёжных пляцоўках горада. Іх з радасцю сустракаюць на адкрыцці міжнародных спартыўных спаборніцтваў, абласных і раённых спартакіяд. З цікавасцю да калектыву ставяцца на раённых конкурсах прыгажосці і грацыі «Міс Кобрын», «Міс Восень» пры падтрымцы БРСМ, на раённых святах, прысвечанных Дню горада, Дню Незалежнасці Рэспублікі Беларусь.

Творчы падыход да працы кіраўнікоў, зацікаўленасць харэаграфіяй навучэнцамі калектыву спрыяе гарманічнаму і дынамічнаму развіццю ансамбля сучаснага танца. Калектыў валодае высокім выканаўчым майстэрствам і карыстаецца заслужаным аўтарытэтам у горадзе, раёне, вобласці, рэспубліцы і па-за яе межамі. З 2022 года ў калектыве працуе балетмайстрам Лізавета Валянцінаўна Макарэвіч, якая ўносіць значны ўклад у творчае развіццё ансамбля.

Ансамбль танца «Модерн» - лаўрэаты і дыпламанты самых разнастайных конкурсаў, аглядаў і фестываляў рознага ўзроўню. Толькі ў 2016/2017 навучальным годзе ансамбль быў удастоены гран-пры міжнароднага фестывалю «Мы — таленты твае, Беларусь!», станавіўся дыпламантам Рэспубліканскага фестывалю «Свет зрабіўся добрым», Міжнароднага фестывалю «Калейдаскоп творчасці. Вясна-2017» у Польшчы, Міжнароднага конкурсу сучаснага мастацтва «Маё пакаленне — 2017».

З 2021 года па 2023 год калектыў удзельнічаў у васьмі міжнародных, рэспубліканскім, чатырох абласных конкурсах і фестывалях.

# Інструментальная група «Хороший день»





Клуб гітарыстаў «Хороший день» на базе Кобрынскага раённага цэнтра дзіцячай творчасці быў створаны ў 1988 годзе педагогам дадатковай адукацыі Аляксандрам Аляксандравічам Вознякам. У рамках клуба была арганізавана канцэртная група «Беркут», якая выступала на мерапрыемствах горада і раёна, прымала ўдзел у конкурсах і фестывалях.

З 2012 года стала дзейнічаць інструментальная група «Хороший день». У яе выкананні гучыць рок-музыка, поп-рок музыка, кавер-музыка, джаз-рок музыка, вакальна-інструментальныя творы.

Кіраўнік інструментальнай групы «Хороший день» А. А. Возняк умее чуйна прыслухоўвацца да эстэтычных патрэб сваіх выхаванцаў, ісці насустрач іх музычным інтарэсам і пры гэтым прывіваць высокую выканальніцкую культуру.



Інструментальная група ўпарта дабіваецца поспехаў у розных конкурсах. Аб гэтым сведчыць мноства грамат і дыпломаў, сярод іх Дыплом I ступені ў абласным этапе IV Рэспубліканскага агляду-конкурсу «Добры дзень, мір!», Дыплом лаўрэата II ступені Міжнароднага фестывалю «Мы разам» і многія іншыя. У 2021 годзе група ўдастоена Дыплома I ступені галоўнага ўпраўлення па адукацыі Брэсцкага аблвыканкама ў намінацыі «Інструментальная музыка».

Узрушаючая энергетыка жывога гуку, сапраўдны выбух станоўчых эмоцый – усё гэта ў музыцы рабят з узорнай групы. Выконваючы сусветныя хіты, яны заўсёды прыўносяць нешта новае ва ўсім вядомыя матывы. Немагчыма не заслухацца выкананнем «Хорошего дня» і проста не верыцца, што гэтыя хлопцы і дзяўчаты ніколі не вучыліся ў музычнай школе, а толькі ў яго, свайго любімага педагога Аляксандра Аляксандравіча…

Узорны інструментальны гурт «Хороший день» і сёння застаецца адзіным у Брэсцкай вобласці калектывам, у складзе якога навучэнцы школ выконваюць інструментальную музыку.

# Студыя выяўленчага мастацтва

Студыя выяўленчага мастацтва створана ў 1974 годзе. Званне народнай прысвоена ў 1983 годзе.





Кіраўнік — Анатоль Рыгоравіч Зуброў, узнагароджаны значком «Выдатнік народнай адукацыі БССР».

Сістэма заняткаў, сама атмасфера, што пануе ў студыі, садзейнічае максімальнаму раскрыццю творчага патэнцыялу. Юныя мастакі — удзельнікі гарадскіх, раённых, абласных выставак дзіцячай творчасці, рэспубліканскіх мастацкіх конкурсаў і міжнародных праектаў ЮНЕСКА.

Работы студыйцаў экспанаваліся больш як у 30 краінах свету: Анголе, Балгарыі, Бельгіі, Венесуэле, Германіі, Грэцыі, Іарданіі, Італіі, Кампучыі, Канадзе, Мексіцы, Нідэрландах, Польшчы, Тунісе, Францыі, Югаславіі, Чэхаславакіі, Японіі і інш.

У 1982 годзе выйшла кніга «Барвы вясёлкі» з малюнкамі гурткоўцаў, у 1986 годзе некаторыя працы патрапілі ў энцыклапедыю «Літаратура і мастацтва

Беларусі». Работы аб Вялікай Айчыннай вайне экспанаваліся ў музеях Мінска і Масквы на Паклоннай гары. Работы на спартыўную тэматыку ўпрыгожвалі сцены стадыёна ў Югаславіі падчас правядзення зімовай Алімпіяды ў г. Сараеве.

Штогод юныя таленты прымаюць удзел у конкурсе «АрхНавацыя» і атрымліваюць дыпломы за подпісам міністра архітэктуры Рэспублікі Беларусь, паспяхова ўдзельнічаюць у пленэрах у Брэсце.

У 2023 годзе была зроблена серыя работ, прысвечаных 210-годдзю Айчыннай вайны 1812 года. Работы экспанаваліся ў Кобрынскім ваенна-гістарычным музеі імя А. В. Суворава і Расійскім пасольстве ў Мінску.

Характэрна, што больш за 140 навучэнцаў студыі выбралі сваю прафесію па профілі гуртка. За плячыма А. Р. Зуброва не толькі перамогі яго вучняў на самых прэстыжных выставах і конкурсах, але і таленавітыя выпускнікі, якія пайшлі па яго слядах. Прафесійнымі мастакамі сталі выпускнікі студыі Барыс Салівончык, Эдуард Качан, Наталля Скарга, Віталь Трафімаў і інш.



З 2024 года студыю выяўленчага мастацтва ўзначаліла Наталля Яўгеньеўна Скарга, годная вучаніца Анатоля Зуброва.

Кобрынскі раённы цэнтр дзіцячай творчасці 75 гадоў з'яўляецца сапраўднай кузняй творчасці, тут нараджаюцца ідэі і раскрываюцца сапраўдныя таленты. Прафесіяналізм педагогаў з'яўляецца залогам поспеху калектываў, паколькі кіраўнікі здолелі закахаць юныя таленты ў цудоўны свет творчасці, які нясе ў сабе каласальную энергію дабра і святла.

Перамогі натхняюць, узнагароды матывуюць, педагогі зноў у пошуку ідэй і рашэнняў, а значыць, мы не раз яшчэ пачуем аб новых дасягненнях, да якіх прыйдуць выхаванцы РЦДТ.

Паспяховыя ўзорныя калектывы дзяржаўнай установы адукацыі «Кобрынскі раённы цэнтр дзіцячай творчасці» з кожным годам здабываюць новыя рысы і грані і, безумоўна, яшчэ доўга будуць утрымлівацца на грэбні поспеху і прызнання. Натхненне і творчасць - неразлучныя сябры і не могуць існаваць адно без аднаго. Увасабляючыся ў творчай асобе, яны абавязкова зробяць нешта таленавітае, прыгожае і яскравае.



РЦДТ – гэта цэлы свет мастацтва, фантазіі і натхнення




РЦДТ – гэта тэрыторыя дзіцячых ініцыятыў, развіцця і творчасці

# СПІС КРЫНІЦ

**Кабакова, Г. Д.** Калектывы Дома творчасці юных Кобрынскага райвыканкома: ансамбль танца «Пралесачкі»; студыя выяўленчага мастацтва; эстрадная студыя «Крыніца» / Г. Д. Кабакова // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. - С. 511. - (Народныя і дзіцячыя ўзорныя калектывы).

**Скоробогатько, И. В.** Об опыте работы с молодежью клуба правовых знаний «Пинкертон» Кобринского районного центра детского творчества / И. В. Скоробогатько // Актуальные проблемы идеологического обеспечения деятельности органов власти : инфорационный бюллетень № 2-3. - Брест, 2006. - С. 98-102.

**Дзяржаўнай** установе адукацыі «Кобрынскі раённы цэнтр дзіцячай творчасці» (1950) – 75 гадоў // Зводны Каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2021–2025 гг. / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. - Кобрын, 2020. - С.  192.

**Ансамблю** танца «Пралесачкі» дзяржаўнай установы адукацыі «Кобрынскі раённы цэнтр дзіцячай творчасці» (1974) – 50 гадоў // Зводны Каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2021–2025 гг. / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. - Кобрын, 2020. - С.  149.

**Студыі** выяўленчага мастацтва дзяржаўнай установы адукацыі «Кобрынскі раённы цэнтр дзіцячай творчасці» (1974) – 50 гадоў // Зводны Каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2021–2025 гг. / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. - Кобрын, 2020. - С. 149.

**Эстраднай** студыі «Крыніца» дзяржаўнай установы адукацыі «Кобрынскі раённы цэнтр дзіцячай творчасці» (1979) – 45 гадоў // Зводны Каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2021–2025 гг. / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. - Кобрын, 2020. - С. 149.

**Амельянчук, І.** Свята талентаў: «МузART» аб'ядноўвае пакаленні / тэкст і фота Ірыны Амельянчук // Кобрынскі веснік. - 2025. - 28 чэрвеня (№ 26). - С. 14 : фат.

Прайшоў канцэрт творчых калектываў Кобрынскага РЦДТ «МузART».

**Бакун, Е.** На волне вдохновения / Елена Бакун ; фото Ирины Омельянчук // Кобрынскі веснік. - 2025. — 4 кастрычніка (№ 40). — С. 6 : фот.

О педагоге дополнительного образования образцовой изостудии Кобринского РЦДТ Наталье Скарге.

**Бакун, Е.** Центр, где живет творчество / Елена Бакун ; фото Ирины Омельянчук // Кобрынскі веснік. – 2025. – 29 лістапада (№ 48). – С. 13 : фот.

Кобринский РЦДТ отметил свой 75-летний юбилей.

**Белая, Н.** Место творчества, вдохновения и силы / [Наталия Белая ; беседовала Юлия Вовк] ; фото из архива Кобринского РЦДТ // Заря. – 2025. – 5 ноября (№ 87). – С. 20 : фот.

Кобринский районный центр детского творчества 5 ноября отмечает 75-летие.

**Курыльчык, Л.** Ведаць. Умець. Дзейнічаць / Людміла Курыльчык ; фота прадастаўлена ўстановай // Настаўніцкая газета. - 2025. — 16 мая (№ 35). — С. 8.

У Кобрынскім раённым цэнтры дзіцячай творчасці працуе адукацыйны міні-цэнтр па бяспецы «Чырвоная кнопка».

**Омельянчук, И.** Живая память / текст и фото Ирины Омельянчук // Кобрынскі веснік. - 2025. — 5 красавіка (№ 14). — С. 15 : фот.

В Кобринском районном центре детского творчества прошел районный этап республиканской выставки-конкурса детского творчества «Победа. Память. Жизнь» в рамках республиканской социально-творческой акции «Послание ветерану».

**Омельянчук, И**. Закрытие смены в лагере «Кружковец»: патриотизм, память и единство / текст и фото Ирины Омельянчук // Кобрынскі веснік. - 2025. — 28 чэрвеня (№ 26). — С. 14 : фот.

Воспитательно-оздоровительный лагерь «Кружковец» при Кобринском районном центре детского творчества завершил работу тематической смены «#КодЕдинства» с девизом «Патриотизм без границ — акцент на общих ценностях».

**Омельянчук, И**. Смех до слез и буря эмоций / текст и фото Ирины Омельянчук // Кобрынскі веснік. – 2025. – 29 лістапада (№ 48). – С. 13 : фот.

Осенний районный турнир среди школьных команд КВН «В будущее с улыбкой» состоялся в Кобринском районном центре детского творчества.

**Бакун, Е.** Золотая весна «Пралесачак» / Елена Бакун ; фото из архива Кобринского РЦДТ // Кобрынскі веснік. - 2024. — 4 мая (№ 18). — С. 16 : фот.

Образцовый танцевальный коллектив «Пралесачкі» Кобринского РЦДТ отмечает свое 50-летие.

**Бакун, Е.** Давайте творить добро / Елена Бакун ; фото из архива ГУО «Кобринский районный центр детского творчества» // Кобрынскі веснік. - 2024. — 1 чэрвеня (№ 22). — С. 12 : фот.

В Кобринском РЦДТ состоялась торжественная церемония награждения участников конкурса детского творчества «Украсим храм вместе» и благотворительного проекта «Давайте творить добро».

**Бакун, Е.** Когда патриотизм не просто слово: как школьники по-новому открывают историю / текст и фото Елены Бакун // Кобрынскі веснік. - 2024. — 23 лістапада (№ 47). — С. 13 : фот.

О музейном занятии у педагога-организатора Кобринского РЦДТ Геннадия Романовича.

**Бакун, Е.** Холст жизни Анатолия Зуброва / Елена Бакун ; фото из архива Кобринского РЦДТ // Кобрынскі веснік. - 2024. — 11 мая (№ 19). — С. 14 : фот.

О педагоге дополнительного образования образцовой изостудии Кобринского РЦДТ А. Г. Зуброве.

**Вовк, Ю.** Ключи от побед / Юлия Вовк ; фото из архива Светланы Чирун // Заря. – 2024. – 1 июня (№ 43). – С. 12 : фот.

Кобринскому образцовому танцевальному коллективу «Пралесачкі» Кобринского РЦДТ - 50 лет.

**Елизарова, Ж.** Мир через искусство / Жанна Елизарова ; фото из архива ГУО «Кобринский РЦДТ» // Кобрынскі веснік. - 2024. - 21 верасня (№ 38). - С. 4 : фот.

В 2024 году Кобринский РЦДТ принял миротворческую эстафету и стал третьим учреждением на Кобринщине, получившим почетный статус «Школа мира».

**Елизарова, Ж.** На работу с радостью, а с работы с гордостью / Жанна Елизарова ; фото: Жанна Елизарова // Кобрынскі веснік. - 2024. — 1 чэрвеня (№ 22). — С. 7 : фот.

По итогам работы за 2023 год директор ГУО «Кобринский районный центр детского творчества» Наталия Белая занесена на Доску почета Кобринского района.

**Кудрявцев, А.** Творческая гавань для юных дарований / Антон Кудрявцев // Кобрынскі веснік. - 2024. — 3 жніўня (№ 31). — С. 13 : фот.

Кобринский районный центр детского творчества на протяжении многих лет остается очагом культурной и образовательной жизни города.

**Огни** «Славянского базара» // Кобрынскі веснік. - 2024. — 20 ліпеня (№ 29). — С. 8 : фот.

Солисты образцовой вокальной студии «Крыніца» ГУО «Кобринский районный центр детского творчества» побывали на XXXIII Международном фестивале искусств «Славянский базар в Витебске».

**Соловей, А.** Кобринскому районному центру детского творчества присвоили статус «Школа мира» / текст и фото Александры Соловей // Кобрынскі веснік. - 2024. — 4 мая (№ 18). — С. 15 : фот.

**Бакун, Е.** Давайте творить добро / Елена Бакун ; фото из архива Кобринского РЦДТ // Кобрынскі веснік. - 2023. — 29 ліпеня (№ 52). — С. 13 : фот.

Благотворительный проект Кобринского районного центра детского творчества признан лучшим в республиканском конкурсе социально-значимых проектов.

**Бакун, Е.** Музыка их связала / Елена Бакун ; фото Елены Бакун и из архива «Крыніцы» // Кобрынскі веснік. - 2023. — 29 сакавіка (№ 23). — С. 8 : фот.

О работе образцовой вокальной студии «Крыніца» ГУО «Кобринский районный центр детского творчества».

**Елизарова, Ж**. Здесь оживает история / Жанна Елизарова ; фото: Жанна Елизарова // Кобрынскі веснік. - 2023. — 1 ліпеня (№ 48). — С. 20 : фот.

В Кобринском районном центре детского творчества состоялось открытие музейной экспозиции «Кобринщина военно-историческая».

**Бакун, Е.** Мир глазами детей / Елена Бакун // Кобрынскі веснік. - 2021. — 9 чэрвеня (№ 45). — С. 8 : фот.

Выставка картин воспитанников образцовой изостудии Кобринского районного центра детского творчества открылась в Кобринском военно-историческом музее им. А. В. Суворова.

**Голод, Е.** «Аматары» победили / Елизавета Голод // Кобрынскі веснік. - 2021. — 21 ліпеня (№ 57). — С. 5 : фот.

Команда «Аматары» Кобринского районного центра детского творчества заняла призовое место в республиканском интернет-квесте «Мастацтва падарожнічаць».

**Гремчук, Т.** Музыкальная семья, или 100 рецептов счастья / Татьяна Гремчук // Кобрин-информ. - 2021. — 1 апреля (№ 13). — С. 4 : фот.

В Кобринском районном центре детского творчества состоялось мероприятие с участием шести семей, дети которых посещают объединения центра.

**Ефтифеева, Н.** Творчество, и еще раз творчество / Наталья Ефтифеева // Кобрин-информ. - 2021. — 9 сентября (№ 36). — С. 4 : фот.

В Кобринском районном центре детского творчества прошел День открытых дверей.

**Кондрашук, Н**. Творческий калейдоскоп / Наталья Кондрашук // Кобрин-информ. - 2021. — 4 ноября (№ 44). — С. 2 : фот.

Воспитанники Кобринского РЦДТ принимают участие в различных мероприятиях и конкурсах.

**Пашкович, Л. В.** С электроникой на «ты» / Людмила Пашкович ; фото автора // Заря. - 2021. — 26 июня (№ 50). — С. 9 : фот. ; Кобрынскі веснік. — 2021. – 23 чэрвеня (№ 49). – С. 5 : фот.

Воспитанник Кобринского РЦДТ Николай Колосун — победитель областного открытого конкурса инженерной графикии и областного этапа олимпиады по информатике.

**Савчук, М.** Копилка «Крыніцы» пополнилась наградами / Маргарита Савчук // Кобрин-информ. - 2021. — 1 апреля (№ 13). — С. 20 : фот.

Солисты образцовой вокальной студии «Крыніца» Кобринского РЦДТ успешно приняли участие в Международном заочном конкурсе искусств.

**Савчук, М.** Маленькие звездочки / Маргарита Савчук // Кобрин-информ. - 2021. — 8 апреля (№ 14). — С. 2 : фот.

Участники вокальной студии «Крыніца» Кобринского районного центра детского творчества — среди победителей Международного фестиваля-конкурса детского творчества «Маленькая звездочка».

**Савчук, М.** Новогоднее театральное волшебство / Маргарита Савчук // Кобрин-информ. - 2021. — 6 января (№ 1). — С. 4 : фот.

ГУО «Кобринский районный центр детского творчества» принял участие в акции «Наши дети».

**Савчук, М.** Победа «Пралесачак» в конкурсе «Акценты — 2021» / Маргарита Савчук // Кобрин-информ. - 2021. — 3 июня (№ 22). — С. 3 : фот.

Участники образцового танцевального коллектива «Пралесачкі» Кобринского РЦДТ — призеры дистанционного II Международного музыкального конкурса современного творчества молодых исполнителей.

**Савчук, М.** Системе дополнительного образования детей и молодежи — 80 лет / подготовила Маргарита Савчук // Кобрин-информ. - 2021. - 11 марта (№ 10). - С. 4 : фот.

Лучшие работники и ветераны системы дополнительного образования Кобринщины, в т. ч. педагоги Кобринского РЦДТ, награждены почетными грамотами

**Чирун, С.** Успехи кобринских «Пралесачак» / [Светлана Чирун ; беседовала] Маргарита Савчук // Кобрин информ. — 2021. – 29 апреля (№ 17). - С. 2.

**Елизарова, Ж.** Архитекторы детских душ / Жанна Елизарова // Кобрынскі веснік. — 2020. — 11 лістапада (№ 87). — С. 6 : фот.

Кобринский районный центр детского творчества отмечает 70-летний юбилей.

**Ализар, К.** Когда песня идет от сердца / Ксения Ализар // Кобрынскі веснік. - 2019. — 30 лістапада (№ 93). — С. 4.

Воспитанники Кобринского районного центра детского творчества успешно выступают на международных конкурсах и фестивалях.

**Бакун, Е.** На уроке у мастера / Елена Бакун // Кобрынскі веснік. - 2019. — 2 сакавіка. — С. 9.

Педагог дополнительного образования Кобринского РЦДТ А. Зубров отметил 70-летний юбилей.

**Вовк, Ю.** «Пралесачкі»: 45 лет на гребне успеха / Юлия Вовк // Кобрин-информ. - 2019. — 30 мая (№ 22). — С. 2.

**Елизарова, Ж**. «Красная кнопка» — это здорово! / Жанна Елизарова // Кобрынскі веснік. - 2019. — 19 кастрычніка. — С. 10.

В Кобринском районном центре детского творчества открылся образовательный мини-центр по безопасности.

**Елизарова, Ж.** Мы вместе! / Жанна Елизарова // Кобрынскі веснік. - 2019. — 26 студзеня. — С. 12.

Коллективы Кобринского РЦДТ - лауреаты международного фестиваля детского и юношеского творчества.

**Пашкович, Л.** «Команда — это сила» / Людмила Пашкович // Кобрынскі веснік. - 2019. — 16 кастрычніка. — С. 4 : фот.

Рисунок воспитанницы Кобринского РЦДТ В. Хуснутдиновой занял II место на республиканском конкурсе детского творчества.

**Савчук, М**. Награды за творчество / Маргарита Савчук // Кобрин-информ. - 2019. — 31 января. — С. 3.

По итогам года Кобринский РЦДТ признан одним из лучших.

**Савчук, М.** Юные таланты покоряют новые вершины / Маргарита Савчук // Кобрин-информ. – 2019. – 28 ноября (№ 48). – С. 3 : фот.

Участники хореографического и вокального коллективов Кобринского РЦДТ завоевывают победы на международных конкурсах и фестивалях.

**Ярмошук, Н.** Приглашает «Красная кнопка»! / Николай Ярмошук // Заря. - 2019. - 5 октября. - С. 12.

В Кобринском РЦДТ открылся образовательный мини-центр по безопасности для обучения правилам безопасной жизнедеятельности детей дошкольного и младшего школьного возраста.

**Савчук, М.** Неповторимые танцы «Модерна» / Маргарита Савчук // Кобрин-информ. - 2017. - 1 июня. — С. 3.

С аншлагом прошли отчетные концерты образцового ансамбля современного танца «Модерн» Кобринского РЦДТ.

**Чэмер, М.** Цэнтр, вокны якога свецяцца дапазна / Мікола Чэмер // Настаўніцкая газета. - 2017. – 2 лістапада. - С. 12.

Кобрынскі раенны цэнтр дзіцячай творчасці часта называюць востравам творчасці і шчасця.

**Игнатюк, В.** Нам этот мир завещано беречь / Валентина Игнатюк // Кобрынскі веснік. - 2015. – 23 мая. – С. 3.

Под таким названием прошёл краеведческий слёт учащихся районного центра детского творчества, который был посвящён 70-летию Великой Победы.

**Казакова, А.** Образцовые «Пралесачкі» / Анна Казакова // Кобрин-информ. – 2015. – 11 июня. – С. 4.

Про танцевальный коллектив «Пралесачкі» Кобринского районного центра детского творчества.

**Ніжнік, Н.** Дом, дзе жыве творчасць / Н. Ніжнік // Кобрынскі веснік. – 2015. – 18 лістапада. – С. 4.

Экскурс у гісторыю Кобрынскага цэнтра дзіцячай творчасці, які ў бягучым годзе адзначыў свой 65-гадовы юбілей.

**Савчук, М.** «Мы город детства в городе!» / Маргарита Савчук // Кобрин-информ. – 2015. – 26 ноября. – С. 4.

В Кобринском Дворце культуры прошел праздник, посвященный 65-летию Кобринского РЦДТ.

**Кондрашук, Н.** Музыкальный источник / Наталья Кондрашук // Кобрин-информ. – 2014. - 12 июня. – С. 4.

Образцовой вокальной студия «Крыніца» Кобринского районного центра детского творчества – 35 лет.

**Кондрашук, Н.** Творчество во всем / Наталья Кондрашук // Кобрин-информ. - 2014. — 11 сентября. — С. 6.

Накануне нового учебного года районный центр детского творчества возглавила Наталия Белая.

**Казакова, А.** Концерт длиною в 40 лет / Анна Казакова // Кобрин-информ. – 2014. – 29 мая. – С. 4.

Свой 40-летний юбилей отметит детский танцевальный коллектив Дома творчества юных «Пралесачка».

**Мацвяйчук, М.** «Крыніца» збірае і выхоўвае таленты / М. Мацвяйчук // Кобрынскі веснік. - 2000. – 7 сакавіка. – С. 4.

Пры Кобрынскім гарадскім Доме піянераў і школьнікаў быў створаны эстрадны ансамбль «Крыніца».

**Пятроўская, М.** Весела і цікава / М. Пятроўская // Кобрынскі веснік. - 2000. – 21 чэрвеня. – С. 2.

Пра Кобрынскі Дом творчасці юных.

**Астраух, В**. У «Пралесачак» - юбілей / В. Астраух // Кобрынскі веснік. – 1999. – 29 мая (№ 43). – С. 2.

**Гарадскі** дом творчасці юных // Кобрынскі веснік. - 1998. – 14 студзеня (№ 4). – С. 3 : фот.

**Ігнацюк, В.** Хто лепш ведае свой край? / В. Ігнацюк // Кобрынскі веснік. - 1998. – 21 студзеня (№ 6). – С. 2.

У раённым Доме дзіцяча-юнацкай творчасці прайшоў конкурс на лепшы турыстычны паход і краязнаўчую экспедыцыю.

**Чубаров, Б. «**Пинкертоны» на школьном меридиане / Б. Чубаров // Кобрынскі веснік. - 1998. – 8 ліпеня (№ 53). – С. 3.

О клубе правовых знаний в Доме творчества юных.

**Хільчук, М.** Дыяпазон работы з дзецьмі пашыраецца / Марыя Хільчук // Кобрынскі веснік. - 1997. – 17 верасня. – С. 2.

**Хільчук, М.** А яшчэ тут ёсць / Марыя Хільчук // Кобрынскі веснік. - 1996. – 7 лютага. – С. 2.

Аб Доме дзіцяча-юнацкай творчасці.

**Юбілей** Дома дзіцяча-юнацкай творчасці // Кобрынскі веснік. – 1995. – 7 чэрвеня (№ 43). – С. 3.

**Ігнацюк, В.** Нам засталася спадчына… / В. Ігнацюк // Кобрынскі веснік. – 1994. – 16 красавіка (№ 30). - С. 2.

Аб рабоце па краязнаўству ў Доме творчасці юных.

**Пятроўская, М.** Дом творчасці рыхтуецца да наваселля / М. Пятроўская // Кобрынскі веснік. – 1994. – 15 кастрычніка (№ 81). – С. 2.

**Хільчук, М**. Шыльда – новая, задачы і ўмовы - ранейшыя / Марыя Хільчук // Кобрынскі веснік. – 1992. – 6 чэрвеня. – С. 2.

Дом піянераў і школьнікаў пачаў называцца гарадскі Дом творчасці юных.

**Грышчук, В.** Свята творчасці і гурткоў / В. Грышчук // Камуністычная праца. – 1982. – 3 чэрвеня.

**Грышчук, В.** Незабыўныя сустрэчы / В. Грышчук // Камуністычная праца. – 1979. – 18 кастрычніка.

Аб гісторыка-краязнаўчым музеі Дома піянераў.

**Сінкавец, Л.** Адзін дзень у Доме піянераў / Л. Сінкавец // Камуністычная праца. – 1978. – 13 мая.

**Багдановіч, Л.** У дружбе с песняй / Л. Багдановіч // Камуністычная праца. – 1971. – 27 сакавіка.

**Царева, Л. И.** Игра-путешествие – это интересно! / Л. И. Царева // Начальная школа. – 1971. - № 10. – С. 19.

# ЗМЕСТ


**Ад складальніка** 3

**І. Ад Дома піянераў да нашых дзён** 5

*Гісторыя станаўлення* 5

**ІІ. Горад дзяцінства ў горадзе** 11

*Дзень сённяшні* 11

**ІІІ. Ад таленавітага педагога да таленавітага дзіцяці** 20

*Узорныя калектывы РЦДТ* 20

танцавальны калектыў «Пралесачкі» 21

вакальная студыя «Крыніца» 24

ансамбль сучаснага танца «Модерн» 26

інструментальная група «Хороший день» 28

студыя выяўленчага мастацтва 30

**Спіс крыніц** 34

# Інфармацыйнае выданне

Інфармацыйна-бібліяграфічнае выданне
з серыі
## «Адукацыя на Кобрыншчыне»

**На беларускай, рускай мовах**

Складальнік
Курачук Святлана Дзмітрыеўна

Камп’ютарная падрыхтоўка выдання: С. Д. Курачук
Мастацкае афармленне вокладкі: П. С. Грыневіч

Надрукавана на камп’ютарна-выдавецкай тэхніцы
Кобрынскай раённай цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы

Вул. Маршала Жукава, 12, 225306, г. Кобрын
Дзяржаўная ўстанова культуры «Кобрынская раённая
цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»
E-mail kobrinlib@gmail.com
www.krcls.by